3. Савельева, И. М. История и время. В поисках утраченного / И. М. Савельева, А. В. Полетаев – М. : Языки русской культуры, 1997.– 800 с.
4. Середа, Н. В. Война 1812 года в дневниках тверских купцов / Н. В. Середа // Тверская губерния в Отечественной войне 1812 года : сборник материалов краеведческой конференции, Тверь, 24 сентября 2002 года. – Тверь : Лилия Принт, 2002. – С.72–80.
5. Середа, Н. В. Дневник купцов Блиновых и его авторы / Н. В. Середа // Очерки феодальной России: – Вып 7. – М. : Едиториал УРСС, 2003. – С. 256–278.

**Сівохін Г. А., Сямашка К. У.**

## ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА І РАБОТА ПА ЎВЕКАВЕЧАННІ ПАМЯЦІ ПРА ЗАГІНУЛЫХ ЯК ФОРМА НЕ-/МУЗЕЙНАГА ВІДУ ДЗЕЙНАСЦІ

***Ключавыя словы:*** ахова спадчыны, увекавечанне, музеі, воінскія пахаванні.

У сучасным беларускім музеі ад музея класічнага сёння застаецца ўсё менш. Заўважныя масавыя тэндэнцыі да мімікрыі пад забаўляльныя ўстановы, якія ў сваёй дзейнасці наогул не грунтуюцца на музейным артэфакце. Разам з тым, прысутнічае і тэндэнцыя да ўтварэння на базе музеяў цэнтраў дакументацыі, калі асноўным аб’ектам вышуку, збору, даследавання і інтэрпрэтацыі становіцца не сам музейны прадмет, а пэўны дакумент, які да яго адсылае.

З аднаго боку, мы назіраем татальныя трансфармацыі шляхоў развіцця музеяў у бок іх дыгіталізацыі. З другога боку – пытанне поўнай адсутнасці фінансавання ў большасці беларускіх музеяў на закупку музейных прадметаў. З трэцяга (гэта актуальна перадусім для краязнаўчых і этнаграфічных музеяў, якія спецыялізуюцца на зборы прадметаў “традыцыйнай” этнаграфіі, але не толькі для іх) можна канстатаваць фактычнае мінімізаванне крыніц папаўнення музейных фондаў. У святле вышэй сказанага актуальным становіцца пытанне пра стварэнне на базе класічных прадметных музеяў цэнтраў дакументацыі культурнай спадчыны – у першую чаргу на аснове лічбавых крыніц. Такі падыход сёння мог бы стаць адным з найбольш перспектыўных шляхоў развіцця музеяў. Натуральна, пры выбары шляху развіцця ў бок дыгіталізацыі нельга адмаўляцца і забывацца пра асноўны музейны від работы – работу з артэфактамі.

Па такім шляху развіцця пайшоў і лоеўскі Музей бітвы за Днепр (далей – Музей). Ад пачатку ведучы работу не столькі па зборы артэфактаў – сведчанняў падзей на берагах Дняпра ў 1943 г., колькі па дакументацыі гісторыі часоў ІІ Сусветнай вайны, Музей арганічна

прыйшоў да стварэння ў 2019 г. на сваёй базе навукова-даследчага і адукацыйнага праекта “Цэнтр дакументацыі культурнай спадчыны” [1]. Тым больш, што музей фактычна ад заснавання займаўся падобай работай: апрача ўжо згаданай закладзенай ад моманту яго стварэння мадэлі цэнтра дакументацыі, на яго, як і на шэраг іншых музеяў Беларусі, з пачатку 2000-х гг. былі “навешаныя” абавязкі па вядзенню работы па навукова-метадычным суправаджэнні дзейнасці райвыканкама па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і па ўвекавечанню памяці пра загінулых пры абароне Бацькаўшчыны і ахвяр войнаў. У 2003 г. на Музей былі ўскладзеныя абавязкі па вядзенню ўліку помнікаў на тэрыторыі Лоеўскага раёна [7]. Прыкладна тады ж ускладзеныя абавязкі па вядзенню работы па ўвекавечанню. Апрача гэтага, цэнтр дакументацыі культурнай спадчыны Музея займаецца ўвекавечаннем памяці ахвяр Халакосту на тэрыторыі Лоева і Лоеўскага раёна, а таксама даследаваннямі тэмы прымусовых работ ваеннага часу [14].

Можна доўга спрачацца, наколькі эфектыўна і мэтазгодна абцяжарваць музейныя ўстановы Беларусі дадатковымі абавязкамі па вядзенню немузейнай работы. Тым больш, музеі не маюць на гэта прававых паўнамоцтваў, чалавечых рэсурсаў і папросту кваліфікаваных кадраў. Пры тым абцяжарванне музеяў робіцца без вызвалення ад асноўнай “музейнай” работы. Але факт застаецца фактам – работа па ахове спадчыны цяпер ускладзеная амаль выключна на музеі. Напрыклад, па стане на канец 2019 – пачатак 2020 са 137 спецыялістаў гар- і райвыканкамаў па краіне, якія адказваюць за ахову гісторыка-культурнай спадчыны, 78 з’яўлялася супрацоўнікамі музеяў, 39 – метадычных цэнтраў і 2 – бібліятэк [8]. Работа па ўвекавечанню разам з дзейнасцю па ахове гісторыка-культурнай спадчыны становіцца не толькі галоўным відам немузейнай дзейнасці беларускіх музеяў, а часта і наогул ледзь не асноўным відам дзейнасці асобных з іх.

Лоеўскі раён – не выключэнне. Ён хаця і не самы багаты на аб’екты з Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь (далей – Спіс) раён Беларусі, але ж і не самы бедны: у Спіс унесеныя 54 “*лоеўскія*” нерухомыя матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці.

З уключаных у Спіс аб’ектаў толькі адзін катэгорыі “1” – гэта мемарыяльны камень, усталяваны на т.зв. месцы фарсіравання Дняпра ў 1943 г. Каштоўнасцяў катэгорыі “2” таксама толькі адна адзінка: “Комплекс былой сядзібы: сядзібны дом з флігелямі, парк” у а.г. Пярэдзелка. Усе астатнія 52 адзінкі маюць катэгорыю “3” – гэта помнікі гісторыі і помнікі археалогіі, якіх налічваецца 27 і 22 адпаведна. Помнікаў архітэктуры ў Спісе 5 адзінак.

Апрача таго, на тэрыторыі раёна размешчанае некалькі дзясяткаў аб’ектаў культурнай спадчыны, якія згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь “Аб культуры” з’яўляюцца культурнымі каштоўнасцямі [12].

Як бачна з папярэдняга аналізу культурнай спадчыны рэгіёну, большая яе частка – гэта “лакальныя” помнікі гісторыі і культуры. Роўна 50 % іх складаюць помнікі гісторыі. З помнікаў гісторыі ўсе аб’екты, за выключэннем згаданага вышэй мемарыяла на месцы фарсіравання Дняпра, уяўляюць воінскія пахаванні: 19 брацкіх магіл, 4 магілы ахвяр войнаў і 3 індывідуальныя воінскія пахаванні. Усе без выключэння – перыяду ІІ Сусветнай вайны.

Пераважная большасць аб’ектаў увекавечання трапіла ў Спіс версіі 2007 г. з ранейшых яго версій: значная частка аб’ектаў разглядалася ў якасці гісторыка-культурнай спадчыны яшчэ за часамі СССР [6]. Аднак і пасля зацвярджэння Спіса версіі 2007 г. “работа” па яго напаўненні брацкімі і індывідуальнымі пахаваннямі воінаў Чырвонай арміі, партызан і мірных грамадзян – ахвяр войнаў не перапынялася, пра што сведчаць далейшыя яго папаўненні менавіта аб’ектамі ўвекавечання. Верагодна, пры наяўнасці ідэалагічнай устаноўкі на папаўненне Спіса, работу па ўключэнню ў яго аб’ектаў увекавечання прадстаўлялася найбольш простай.

Пераважная частка работы па ўвекавечанню ў Лоеўскім раёне зараз ускладзеная на Музей. Пры гэтым яго супрацоўнікі не з’яўляюцца дзяржаўнымі службоўцамі і не валодаюць дзяржаўна-ўладнымі паўнамоцтвамі, фармальна імі можа ажыццяўляцца толькі навукова-метадычнае суправаджэнне працы аддзела ў галіне ўвекавечання.

У выніку навуковай і палявой работы, якая праводзіцца супрацоўнікамі Музея, рэгулярна высвятляюцца імёны загінулых, пахаваных у брацкіх магілах. Музеем арганізаваная праца па першасным уліку пахаванняў загінулых падчас войнаў і рэгістрацыі пахаванняў замежных вайскоўцаў. У рамках гэтай дзейнасці пашпартызаваныя 36 пахаванняў. Пашпарты сістэматызаваныя па тэрытарыяльным прынцыпе і захоўваюцца ў Музеі. У сувязі са зьяненнямі ва ўліковых дадзеных воінскіх пахаванняў на бягучы момант праводзіцца праца па складанні новых пашпартоў [9; 10; 11].

Музеем таксама арганізаваная работа па вядзенні раённага аўтаматызаванага банка дадзеных “Книга памяти”. У хадзе правядзення архіўна-даследчых работ праз аддалены доступ да архіўных устаноў (агульнадаступныя базы дадзеных “Мемарыял”, “Памяць Народа”, “Подзвіг Народа”, Arolsen Archives) за перыяд 2015–2020 гг. вызначаныя 1 135 раней невядомых прозвішчаў загінулых на тэрыторыі Лоеўскага раёна савецкіх жаўнераў. У больш чым 2 000 загінулых скарэктаваныя і верыфікаваныя ўліковыя дадзеныя (асабістыя дадзе-

ныя, дата нараджэння, месца нараджэння, месца прызыву, прычына і месца выбыцця, дадзеныя сваякоў загінулага). На працягу 2019 г. Музеем устаноўлены 141 раней невядомая прозвішча пахаваных салдат, звесткі аб іх унесеныя ва ўліковыя дадзеныя воінскіх пахаванняў. Па стане на 2020 г. колькасць пахаваных у воінскіх пахаваннях і пахаваннях ахвяр войнаў – 11 858 пахаваных, у тым ліку дадзеныя якіх устаноўлены – 11 657 пахаваных, невядомых – 201 пахаваных [9; 10; 11].

Як бачна з прыведзенага вышэй аналізу, на аб'ектах увекавечання – брацкіх і індывідуальных пахаваннях пастаянна вядзецца работа. Пачынаючы з канца 1940-х гг. рэгулярна – не менш, чым раз на дзесяцігоддзе, – выходзілі пастановы Ураду БССР па персанальным уліку, прывядзенні ў адпаведны санітарны стан, перапахаванні і ўзбуйненні месцаў пахавання, іх даглядзе і добраўпарадкаванні, таксама выдаваўся і шэраг лакальных нарматыўна-прававых актаў [13]. Дагэтуль у выніку даследчай і пошукавай работы наносяцца новыя імёны на пайменныя пліты і г.д., што часта не проста прынцыпова, а незваротна зменьвае аблічча аб'ектаў ўвекавечання.

Сёння работы па ўвекавечанню, якія арганізоўваюцца перад усім пад эгідай Міністэрства абароны, актыўна працягваюцца: праводзяцца пошукавыя работы, раскопкі, перапахаванні і нанясенні выяўленых імёнаў на пахаваннях. Работы, уключаючы і ўлік воінскіх пахаванняў, нанясенне імёнаў, падзахаванні, добраўпарадкаванне, рамонтна-рэстаўрацыйныя работы і г.д., – праводзяцца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам аб увекавечанні, якое пры гэтым уступае ў пярэчанне з заканадаўствам у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, бо падчас іх правядзення аказваецца значнае ўздзеянне на матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якое прыводзіць да іх змянення. І дадзеныя работы як правіла, праводзяцца без навуковага ці якогась іншага абгрунтавання, як таго вымагае заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Такім чынам, апрача падвоенага ўліку воінскіх пахаванняў – і Міністэрствам абароны, і Міністэрствам культуры, – назіраецца сітуацыя, калі дзеля выканання заканадаўства па ўвекавечанню пры правядзенні работ на аб'ектах часта мае месца ігнараванне норм заканадаўства па ахове спадчыны як з боку ўласнікаў, так і адпаведных дзяржаўных органаў.

Выкананне ж заканадаўства па ахове спадчыны часта не толькі не магчымае, але і, будзем чэсныя, немэтазгоднае. Справа не ў тым, што вырабленыя за савецкімі часамі манументы, помнікі з бетону не толькі тыповыя і быццам не ўяўляюць асаблівай каштоўнасці і вырабленыя з недаўгавечных матэрыялаў. Насамрэч, яны з'яўляюцца сведчаннем эпохі і адбіваюць цэлы пласт у эстэтычным развіцці, а таму нату-

ральна, уяўляюць і гістарычную, і мастацкую каштоўнасць. Нават у параўнанні з першапачатковымі задумай і выкананнем ужо кардынальна змененыя на сённяшні час, шмат якія з іх застаюцца помнікамі сваёй эпохі.

Але для іх захавання неабходна прымаць кардынальныя/радыкальныя меры па правядзенні выратавальных рамонтных работ. І часта – вельмі аператыўна. А патрабаванні Кодэкса Рэспублікі Беларусь "Аб культуры" вельмі стрымліваюць і не спрыяюць правядзенню такіх рамонтна-рэстаўрацыйных работ.

Трэба прызнаць, што насамрэч, "вайсковы" ўлік аб'ектаў увекавечання – больш дзейная мера па іх захаванні ў параўнанні з унясеннем тых у Спіс. Больш за тое, як паказвае практыка, не гледзячы ні на якія *кодэксы* змяненні былі, ёсць і будуць… І кодэксы не абараняюць, наадварот, часта спрыяюць разбурэнню аб'ектаў, стрымліваючы развіццё сучасных практык камемарыцыі і ўяўленняў пра "недзяржаўныя" практыкі палітыкі памяці / гістарычнай памяці. Тыя ж народныя "нізавыя/наіўныя" мемарыялы, якія мы можам назіраць на шэрагу брацкіх пахаванняў [2; 3; 4; 5], пры правядзенні рамонтна-рэстаўрацыйных работ у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь "Аб культуры" руйнуюцца. Такім чынам, уключэнне ў Спіс не столькі спрыяе захаванню аб'ектаў, а стварае сітуацыю ўмоўнай "кансервацыі", якая ў выніку прыводзіць да разбурэння.

Таксама, пры ўсёй спрэчнасці ідэалагічнага кантэнту савецкай і постсавецкай беларускай палітыкі памяці, знаходжанне брацкіх магіл у Спісе фармалізуе практыкі камемарацыі і пярэчыць "жывым" натуральным камемаратыўным практыкам, іх трансляцыі, перадачы да новых генерацыяў і натуральнаму аўтахтоннаму развіццю, надаючы аб'ектам увекавечання дадатковы ідэалагічны і фармалізавальны флёр.

Натуральным выйсцем з дадзенай сітуацыі было б выключэнне аб'ектаў увекавечання са Спісу (магчыма, апрача найбольш значных і важных з гістарычнага ці мастацкага пункту гледжання) і пакіданне іх выключна ў сферы дзеяння заканадаўства па ўвекавечанню памяці аб загінулых пры абароне Бацькаўшчыны і ахвяр войнаў.

1. Аб культурна-адукацыйнай і выставачнай рабоце [Электронны рэсурс] : загад дырэктара музея па асноўнай дзейнасці ад 18 снежня 2019 г. № 29 // МБЗД. – Ф. 2. Воп. 7. Спр. 8. – 1 дак. у эл. выгл. (78,5 Кб).
2. Акт обследования состояния братских захоронений и памятников, расположенных на территории Лоевского района рабочей группой по проведению мониторинга воинских захоронений, могил жертв фашизма и памятников воинской славы Лоевского районного исполнительного комитета от 23 апреля 2020 г. [Электронны рэсурс] // МБЗД. – Ф. 3. Воп. 7. Спр. 7. – 1 дак. у эл. выгл. (33 Кб).

3. Акт обследования состояния братских захоронений и памятников, расположенных на территории Лоевского района рабочей группой по проведению мониторинга воинских захоронений, могил жертв фашизма и памятников воинской славы Лоевского районного исполнительного комитета от 27 февраля 2020 г. [Электронны рэсурс] // МБЗД. – Ф. 3. Воп. 7. Спр. 7. – 1 дак. у эл. выгл. (32 Кб).
4. Акты правядзення маніторынгу (праверкі стану захаванасці і выкарыстання) аб'ектаў гістарычнай і культурнай спадчыны (нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў) і ўвекавечання памяці аб загінулых за 2019 г. [Электронны рэсурс] // МБЗД. – Ф. 4. Воп. 6. Спр. 1. – 32 дак. у эл. выгл. (1,23 Гб).
5. Акты правядзення маніторынгу (праверкі стану захаванасці і выкарыстання) аб'ектаў гістарычнай і культурнай спадчыны (нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў) і ўвекавечання памяці аб загінулых за I кв. 2020 г. [Электронны рэсурс] // МБЗД. – Ф. 4. Воп. 7. Спр. 1. – 19 дак. у эл. выгл. (399 Мб).
6. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гомельская вобл. – Мінск : БелСЭ, 1985. – 383 с.
7. Информация о Музее битвы за Днепр [Электронны рэсурс] : 2003 // Навуковы архіў Музея бітвы за Днепр (МБЗД). – Ф. 2 Воп. 2. Спр. 1–1 дак. у эл. выгл. (1,89 Мб).
8. О создании районной вертикали системы государственного управления в сфере охраны историко-культурного наследия [Электронны рэсурс] : письмо Министерства культуры от 05.12.2019 № 04-09/6614 // МБЗД. – Ф. 4. Воп. 6. Спр. 5. – 1 дак. у эл. выгл. (6,05 Мб).
9. О ходе выполнения в 2019 году регионального комплекса мероприятий по реализации государственной программы на 2015–2020 годы по увековечению погибших при защите Отечества и сохранению памяти о жертвах войн на 2016–2020 годы [Электронны рэсурс] // МБЗД. – Ф. 3. Воп. 6. Спр. 6. – 1 дак. у эл. выгл. (27 Кб).
10. Отчет отдела идеологической работы, культуры и по делам молодежи Лоевского районного исполнительного комитета об организации работы по увековечению памяти защитников Отечества и сохранении памяти о жертвах войн на территории Лоевского района [Электронны рэсурс] // МБЗД. – Ф. 3. Воп. 7. Спр. 6. – 1 дак. у эл. выгл. (35,3 Кб).
11. Сведения о выполнении показателей Государственной программы по увековечению погибших при защите Отечества и сохранению памяти о жертвах войн в 2019 году [Электронны рэсурс] // МБЗД. – Ф. 3. Воп. 6. Спр. 6. – 1 дак. у эл. выгл. (22 Кб).
12. Список объектов наследия Лоевского района [Электронны рэсурс] // МБЗД. – Ф. 4. Воп. 7. Спр. 4. – 1 дак. у эл. выгл. (519 Кб).
13. Увековечение памяти защитников Отечества и жертв войн в Беларуси 1941–2008 гг. : док. и материалы / сост. : В.И. Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2008. – 304 с.
14. Цэнтр дакументацыі культурнай спадчыны Музея бітвы за Днепр [Электронны рэсурс] / Музей бітвы за Днепр. – Рэжым доступу : http://loyev.museum.by/be/node/48570. – Дата доступу: 04.05.2020.